МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
Кафедра сацыяльнай камунікацыі

ЦІМОХАЎЦАВА Ірына Юр’еўна

# КАМУНІКАЦЫЙНЫЯ СТРАТЭГІІ ПРАСОЎВАННЯ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ: АБГРУНТАВАНАЯ ТЭОРЫЯ

Магістарская дысертацыя
АНАТАЦЫЯ

Спецыяльнасць 1-23 80 11 Камунікацыі

Навуковы кіраўнік:
Гафарава Юлія Юр'еўна
кандыдат філасофскіх навук,
дацэнт

Мінск, 2021

# АНАТАЦЫЯ

Камунікацыйныя стратэгіі прасоўвання з'яўляюцца важным стратэгічным элементам у дасягненні эканамічных і сацыяльна-культурных мэтаў беларускіх мастакоў. Рэалізацыя іх творчага патэнцыялу неабходна для стварэння духоўнага багацця краіны. Таму ад паспяховасці іх авалодання дадзенай задачай залежыць не толькі іх асабістая рэалізацыя, але і культурная спадчына Беларусі для наступных пакаленняў.

Аб'ект даследавання магістэрскай дысертацыі – беларускія мастакі. Прадмет даследавання магістэрскай дысертацыі – камунікацыйныя стратэгіі пасоўвання беларускіх мастакоў.

Падчас напісання магістэрскай дысертацыі былі атрыманы наступныя вынікі: аналіз тэарэтычных падстаў камунікацыйных стратэгій прасоўвання мастакоў; аналіз сістэмы арт-рынку і бягучай сітуацыі на сусветным і беларускім арт-рынку; удакладнены метадалагічныя асаблівасці даследаванні метадам абгрунтаванай тэорыі камунікацыйных стратэгій прасоўвання мастакоў; прапанавана з акцэнтам на камунікацыйныя стратэгіі парадыгма прасоўвання беларускіх мастакоў паводле метаду абгрунтаванай тэорыі; выяўлены фактары, якія тармозяць мастакоў ў пытаннях прасоўвання, а таксама праблемныя зоны камунікацыйных стратэгій прасоўвання беларускіх мастакоў.

Навізна атрыманых вынікаў абумоўлена малавывучанасцю спецыфікі камунікацыйных стратэгій прасоўвання беларускіх мастакоў. Атрыманыя вынікі характарызуюцца шырокімі магчымасцямі тэарэтычнага і практычнага прымянення. Матэрыялы магістэрскай дысертацыі могуць выкарыстоўвацца ў навучальным працэсе, а таксама пры далейшым даследаванні камунікацыйных стратэгій прасоўвання беларускіх мастакоў, у тым ліку пры фарміраванні і рэалізацыі камунікацыйнай стратэгіі прасоўвання беларускага мастака.

Структура магістарскай дысертацыі ўключае ў сабе тры главы. Першая глава прысвечана тэарэтычным асновам камунікацыйных стратэгіям прасоўвання беларускіх мастакоў. У другой главе прыводзіцца тэарэтычны разгляд феномену арт-рынку. У трэцяй главе прадстаўлены метадалогія даследавання і парадыгма паводле метаду абгрунтаванай тэорыі з вынікамі аналізу даследавання.

*Ключавыя словы: камунікацыйныя стратэгіі, прасоўванне, арт-рынак, мастак, выяўленчае мастацтва, абгрунтаваная тэорыя.*